Разгадчык слова роднага

"Назвы, імёны — гэта сімвалы пэўнага часу, ладу жыцця, традыцый і звычаяў, той ці іншай культуры. І калі людзі абараняюць пэўныя назвы, яны тым самым адстойваюць сваё ўяўленне аб рэчаіснасці".

Гэтыя радкі з новай кнігі доктара філалагічных навук, прафесара кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства Аляксандра Рогалева ў нейкай ступені вызначаюць яго пазіцыю як чалавека і вучонага, канцэпцыю яго творчасці.

На рахунку прафесара — каля 1500 друкаваных работ. Яго кнігі "От Гомеюка до Гомеля", "Белая Русь и белорусы", "Этнотопонимия Беларуси", "Сцежкі ў даўніну" для студэнтаў сталі хрэстаматыйнымі. І не толькі для студэнтаў. Іх практычна немагчыма заспець на бібліятэчнай паліцы з прычыны высокай запатрабаванасці.

Творчае супрацоўніцтва з такімі салідным перыядычнымі выданнямі, як "Наш современник", "Литературная Россия", "Литература в школе", "Нёман", "Культура", дало свой плён. Імя прафесара Рогалева стала вядомым шырокаму колу чытачоў.

Днямі ў літаратурна-мастацкім салоне "Сустрэчы на Замкавай" пры Гомельскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.І.Герцэна прайшла прэзентацыя кнігі А.Рогалева "Родные названия: Топонимический словарь Гомеля и его окрестностей", якая выдадзена Гомельскай абласной арганізацыяй грамадскага аб'яднання Беларускага таварыства "Кніга".

На прэзентацыі калегі і сябры аўтара, гомельскія пісьменнікі, прадстаўнікі таварыства "Кніга" і Цэнтра навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, журналісты зазначылі, што работы А.Рогалева запоўнілі недастаткова даследаваную нішу ў галіне тапанімікі. Але ж для яго гэта не проста сродак для здабычы хлеба надзённага, але і глыбокая, шчырая любоў да слова, назвы, да роднага краю. Былыя ягоныя аднакурснікі згадваюць, што ўжо ў студэнцкія гады ён паглыблена займаўся тапанімікай. Адзначалася незвычайная працаздольнасць

гады ён паглыблена займаўся тапанімікай. Адзначалася незвычайная працаздольнасць прафесара, яго падзвіжніцкая дзейнасць у гарадскім краязнаўчым таварыстве, якое функцыянуе пры бібліятэцы. Студэнты прафесара Рогалева, былыя і цяперашнія, падкрэсліваюць засяроджанасць выкладчыка на навуковай рабоце. І яшчэ — тактоўнасць, выхаванасць, пачуццё годнасці. Ён захапляе сваёй адданасцю працы, нестандартным мысленнем, уменнем зацікавіць сваімі лекцыямі нават абыякавых. І многія з іх выбіралі для курсавых і дыпломных работ тэмы, рэкамендаваныя прафесарам, многія дамагліся значных поспехаў у сваёй працоўнай дзейнасці.

У кнізе "Родные названия", якая змяшчае больш за 700 назваў, аўтар акцэнтуе ўвагу на пытаннях, ці ўсе геаграфічныя назвы ўяўляюць каштоўнасць з гістарычна-культурнага пункта гледжання і якія крытэрыі дазваляюць вылучыць вартыя лічыцца помнікамі гісторыі, мовы і культуры, чаму частка людзей настойліва патрабуе вяртання гістарычнай назвы горада, вуліцы і чаму для большасці з нас назва ўсяго толькі голас, гукі, літары, а не нейкая "...психическая, духовная, нравственная сущность Слова и Названия". На гэтыя і шэраг іншых спрадвечных пытанняў Рогалеў дае грунтоўныя і пераканаўчыя адказы.

У гэтай і іншых сваіх кнігах аўтар смела вылучае новыя гіпотэзы, напаўняе іх свежымі ідэямі, цікавымі фактамі, арыгінальнай падачай агульнавядомых з'яў і паняццяў, па магчымасці пазбягаючы сухога акадэмізму.

Бібліятэка падрыхтавала да прэзентацыі маляўнічы буклет, дзе поруч з тэкстам змешчана бібліяграфія кніг А.Рогалева і публікацый у перыёдыцы, а таксама выстаўку яго ных кніг, артыкулаў, фактаграфічных матэрыялаў, фотаздымкаў, водгукаў чытачоў.

У наш занадта прагматычны час, калі маральныя арыенціры часткова страчаны, а часткова размыты, прафесар Рогалеў імкнецца прывіць новай плеядзе студэнтаў устойлівыя паняцці аб працавітасці, руплівасці, адданасці справе.

Наталля МАЛАШЭНКА,
загадчыца аддзела Цэнтральнай
гарадской бібліятэкі імя А.І.Герцэна
г.Гомеля,
ўдзячая салона "Сустрэчы на Замкавай"